Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (142), 2024

УДК 811.161.3’42’373.612.2:398.61(=161.3) EDN: POBYAV

# Іншасказальныя вобразы флоры ў беларускіх народных загадках

А.А. Станкевіч

Аб’ектам даследавання ў артыкуле з’яўляюцца беларускія народныя загадкі, прысвечаныя раслінnаму свету, мэтай – вызначэнне моўных спосабаў іншасказальнай вербалізацыі іх дыскурсу. У артыкуле акрэсліваецца тэматычны спектр загадак пра флору, указваюцца асноўныя мадэлі структурна-семантычнага арганізацыі іх зместу (загадкі-метафары, -апісанні, -пытанні, -мініяцюры), аналізуюцца прыёмы іншасказальнай вербалізацыі дыскурсу загадак пра расліны, заснаваныя на метафарычным мадэляванні іх семантыкі, якія ўключаюць антрапаморфны, зааморфны, арнітаморфны і рэчыўны коды, адзначаюцца моўныя і стылёвыя адметнасці адмоўных загадак, загадак-пытанняў і -мініяцюр, звяртаецца ўвага на кагнітыўную, лінгвапрагматычную і эстэтычную функцыі загадак пра флору.
**Ключавыя словы:** загадка, іншасказальны вобраз расліны, дэнатат, субстытут, структурна-семантычныя мадэлі загадак, вербалізацыя зместу, антрапаморфны, зааморфны, арнітаморфны, фітаморфны і рэчыўны коды.

The object of research in the article is Belarusian folk riddles dedicated to the plant world, the purpose is to determine the linguistic ways of allegorical verbalization of their discourse. The article outlines the thematic spectrum of riddles about flora, indicates the main models of the structural and semantic organization of their content (riddles-metaphors,- descriptions,- questions,- miniatures), analyzes the techniques of allegorical verbalization of the discourse of riddles about plants based on metaphorical modeling of their semantics, including anthropomorphic, zoomorphic, ornithomorphic and real codes, notes linguistic and stylistic features of negative riddles, riddles-questions and miniatures. The attention is drawn to the cognitive, pragmatic and aesthetic functions of riddles about flora.
**Keywords:** riddle, allegorical image of a plant, denotation, substitute, structural and semantic models of riddles, verbalization of content, anthropomorphic, zoomorphic, ornithomorphic, phytomorphic and real codes.

Загадкі з’яўляюцца адным з самых арыгінальных і займальных малых жанраў вуснай народна-паэтычнай творчасці. Звернутыя непасрэдна да адрасата, яны садзейнічаюць развіццю яго мысленчай здольнасці, фарміраванню навыкаў назіральнасці, лагічнага разважання, кемлівасці і дасціпнасці, з’яўляюцца своеасаблівым сродкам пазнання. Паводле меркавання фалькларыстаў, «тэрмін загадка ўтварыўся ад старажытнага «гадати», што азначае думаць, разважаць» [1, с. 10]. Загадкі, акрамя таго, развіваюць наглядна-вобразнае ўспрыманне прадметаў і з’яў аб’ектыўнай рэчаіснасці.

Загадкай называюць «іншасказальнае вобразнае апісанне якога-небудзь прадмета або з’явы на аснове падабенства паміж утоеным прадметам, які трэба адгадаць, і тым, які замяняе яго ў загадцы» [1, с. 10]. «Для загадкі характэрна своеасаблівае збліжэнне двух, нярэдка далёкіх адзін ад аднаго, прадметаў, з’яў прыроды або жывых істот» [2, с. 77]. Як лічаць даследчыкі, «загадкі не выходзяць за межы прадметаў і з’яў, блізкіх чалавеку ў яго паўсядзённым жыцці і працы, назіраемых, бачных, часта сустракаемых і вядомых большасці людзей» [3, с. 97].

У беларускіх народных загадках шырока адлюстраваўся прыродны свет, матэрыяльны побыт чалавека, сфера яго гаспадарчай дзейнасці, грамадскія і сямейныя адносіны. Загадкі пра прыроду прысвечаны нябесным свяцілам, зямлі і вадзе, стыхіям, расліннаму і жывёльнаму свету.

Аб’ектам аналізу ў дадзеным артыкуле з’яўляюцца беларускія народныя загадкі пра раслінны свет, змешчаныя ў зборніку «Загадкі» (серыя «Беларуская народная творчасць») [4], мэтай – вызначэнне моўных спосабаў іншасказальнай вербалізацыі зместу ў адзначаных загадках.

Беларускія народныя загадкі пра раслінны свет надзвычай разнастайныя, іх дэнататы (загаданыя аб’екты) уключаюць розныя рэаліі флоры: гэта дрэвы хваёвыя: «*І зімой, і летам усё адным цветам*. Хваёвае дрэва» [4, № 407]; лісцёвыя: «*Вясна прыгрэе, шубу надзене; зіма наступае, шубу скідае*. Лісцёвае дрэва» [4, № 402]; плады лясных дрэў: «*Малы малышак упаў з вышак, ён не забіўся, адно шапачкі пазбыўся*. Жолуд, арэх» [4, № 440]; садавіна: «*Круглы, ды не гарбуз, з хвастом, ды не мыш*. Яблык» [4, № 801]; лясныя дары – ягады: «*Стаіць паненачка ў краснай су-*

*кеначцы, хто йдзе – паклоніцца.* Суніца» [4, № 474]; грыбы: «*А і ў лазе стаіць баран на адной назе.* Грыб» [4, № 499]; травы: «*Рос белы шар, падуў вецер – і шар паляцеў.* Адуванчык» [4, № 527]; палявыя: «*Увосень рассыпаецца, улетку збіраецца, само поўнае бывае, людзей накармляе.* Жыта» [4, № 540] і агароднія культуры: «*Ляжыць сярод градкі зялёны і гладкі.* Агурок» [4, № 698].

Самую значную ў колькасных адносінах групу складаюць загадкі пра агародныя культуры, і гэта зразумела, таму што агароду заўсёды народ удзяляў многа часу і ўвагі, ён быў для беларуса важным падспор'ем у харчаванні, знаходзіўся бліжэй да дому, чым лес і поле.

Структурна-семантычнае мадэляванне зместу ў беларускіх народных загадках пра раслінны свет уключае наступныя лінгвістычныя мадэлі кадзіравання дэнатата: загадкі-метафары: «*У цямніцы сядзіць царыца, косы на дварэ.* Морква» [4, № 747]; загадкі-апісанні: «*Маленька, сухенька ўсіх адзявае.* Лён» [4, № 599]; загадкі-пытанні: «*Што гэта за дзерава зіму і лета зелена*? Хвоя» [4, № 409]; загадкі-невялікія мініяцюры: «*Пайду ў лес, выламлю цялеш, з гэтага целяша выберу два каўша, дзве пласціны, карэц і шыла канец.* Жолуд» [4, № 437].

Загадкі пра раслінны свет, як і іншыя тэматычныя групы, заснаваны на супастаўленні розных зашыфраваных прадметаў і з'яў і іх субстытутаў паводле падобных, блізкіх знешніх або ўнутраных якасцей і ўласцівасцей.

Як адзначае В.В. Мітрафанава, «паэтычнасць, мастацкая дасканаласць загадкі залежаць не толькі ад таго, як арганізаваны слоўны матэрыял рытмічна і сінтаксічна, але і ад таго, наколькі выразна, трапна, наглядна выбрана прыкмета, якасць аб'екта загадвання, якія вызначаюць прадмет замяшчэння» [3, с. 109].

Адной з самых істотных адметнасцей дыскурсу народных загадак з'яўляецца іншасказальная форма выражэння яго зместу. Іншасказальныя вобразы народных загадак пра раслінны свет вельмі разнастайныя, дастаткова канкрэтныя і рэалістычныя і, як правіла, узяты з паўсядзённага народнага жыцця.

Іншасказальная вербалізацыя дыскурсу народных загадак пра расліны даволі часта засноўваецца на метафарычным мадэляванні іх зместу. Пры гэтым выкарыстоўваюцца разнастайныя прыёмы іншасказання, у якія ўключаюцца антрапаморфны, зааморфны, арнітаморфны і рэчыўны коды.

У некаторых загадках пры іншасказальнай вербалізацыі назваў рэалій флоры выкарыстоўваюцца антрапаморфныя вобразы, як правіла, абагуленыя, заснаваныя на персаніфікацыі. Субстытутамі загаданага дэнатата ў такіх загадках з'яўляюцца асабовыя намінацыі: «*Усе **паны** скінулі кафтаны, а адзін **пан** не скінуў кафтан.* Лісцёвыя і хваёвыя дрэвы» [4, № 404]; «*Стаіць **паненачка** ў краснай сукеначцы, хто йдзе – паклоніцца.* Суніца» [4, № 474]; «*Сярод лесу **паніч** вісіць.* Арэх» [4, № 456]; «*Стаіць **дзед** пры дарозе на адной нозе.* Грыб» [4, № 496]; «*Сярод гарода стаіць **ваявода**, хто за яго прымецца, той сам скрывіцца.* Дзядоўнік» [4, № 519]; «*У лазе стаіць **казак** на адной назе.* Грыб» [4, № 498]; «*Сядзіць **красавіца** ў цямніцы, а каса на вуліцы.* Морква» [4, № 746]; «*Стаіць **пані** ў сарафане, сталі яе раздзяваць – сталі плакаць і рыдаць.* Цыбуля» [4, № 605]. Сустракаюцца загадкі, у якіх персаніфікацыя выражаецца праз уласныя імёны: «*Паміж гор сядзіць **Рыгор**, капелюшом накрыты.* Грыб» [4, № 508]; «*Стаіць **Хадосця**, растрапаўшы валосця.* Каноплі» [4, № 578]; «*Між гор мерзне **Ягор** панчошкай накрыты.* Гарох у стручку» [4, № 589]; «*Румяны **Піліп** да палкі прыліп.* Яблык» [4, № 800].

На празапапеі (адухаўленні) заснаваны абагульнены вобраз расліны: «*Дыхае, расце, а хадзіць не можа.* Расліна» [4, № 396].

У некаторых загадках адсутнічае субстытут, які замяшчае загаданы прадмет, а ўказваецца толькі яго дзеянне: «*Летам адзяваецца, зімой раздзяваецца.* Дрэва» [4, № 398]; «*Стаіць у лазе на адной назе, сам не спіць, а другім сну дае.* Макаўка» [4, № 776] або ўласцівасць: «*Рук многа, а нага адна.* Дрэва» [4, № 397].

Зааморфныя вобразы ў загадках пра раслінны свет сустракаюцца часцей, чым антрапаморфныя. Субстытутамі загаданых рэалій флоры выступаюць, як правіла, вобразы хатніх жывёл: «***Аўца (баран)** стаіць, воўна дрыжыць.* Асіна» [4, № 416]; «*У лазе на трапязе сядзіць **каза** на адной назе.* Грыб» [4, № 500]; «***Карова** ў пуню – хвост на пуню.* Жыта і салома» [4, № 545]; «*Чорная **свінка** мае тры спінкі.* Грэчка» [4, № 598]; «***Баран** у хляве, ногі на дварэ.* Часнок» [4, № 650] або птушак: «*Стаіць **гусак** над вадой, трасе барадой.* Чарот» [4, № 514]; «*На кургане, на вургане стаіць **курачка** з сяргамі.* Авёс» [4, № 548]; «*На коліку сем **саколікаў**,*

*кожны ў капотачцы.* Авёс» [4, № 550]; «***Певень** у зямлі, а косы наверсе.* Бурак» [4, № 677]. У такіх загадках іншасказальна называюцца асобныя прыкметы зашыфраваных прадметаў, якія ўносяць дадатковую падказку ў разгадку: *з барадой* (чарот), *з сяргамі* (авёс), *у капотачцы* (авёс), *косы* (лісце ў бурака), *ногі* (стрэлкі часнака).

Даволі часта метафарычнае мадэляванне дыскурсу загадак пра раслінны свет адбываецца на аснове рэчыўнага коду, апрадмечвання загаданага дэнатата, які ўвасабляецца ў выглядзе пэўнай рэаліі: «*Двое **начовак** і дзве **скібкі сала**.* Жолуд» [4, № 442]; «*У маленькім **гаршчочку кашка** смачненькая.* Арэх» [4, № 445]; «*У лесе, у лесе чырвоная **плахта** вісіць.* Рабіна» [4, № 419]; «*Шмат на ёй **іголак**, але ўсе без вушак.* Шыпулькі на елцы» [4, № 430]; «*Семдзесят **адзёжак**, ды ўсе без **засцёжак**.* Капуста» [4, № 661]; «*Чырвоны **цвік** у зямлю ўбіт.* Бурак» [4, № 684]; «*У балазе, балазе стаіць **хатка** на адной назе.* Грыб» [4, № 502]; «*Стаяць **слупы** бялёныя, на іх **шапкі** зялёныя.* Бярозы» [4, № 412]; «*Стаіць **кіёк**, на тым кійку – **клубок**.* Капуста» [4, № 670]; «*Стаіць **палка**, а на той палцы **шапка**.* Грыб» [4, № 509]. Субстытутамі зашыфраванага дэнатата з'яўляюцца рэаліі паўсядзённага побыту чалавека – посуд, адзенне, ежа, прыстасаванні для працы, пабудовы і інш.

Як паказваюць прыклады, апісанне зашыфраваных рэалій флоры пры метафарызацыі даволі аднастайнае: загаданы аб'ект з'яўляецца статычным – ён *стаіць, сядзіць, дзяржыць, вісіць, мерзне, прыліп, скінуў, убіты.*

У загадках-апісаннях характарызуецца, як правіла, знешні выгляд загаданага прадмета – яго форма, памер, колер, структура, размяшчэнне і інш.: «*Чырвоны колер, вінны смак, каменнае сэрца.* Вішня» [4, № 810]; «*Пад дубком-каратышком ні клубком, ні камяшком.* Жолуд» [4, № 441]; «*Красная шапка, белая галоўка.* Маліна» [4, № 815]; «*Саламяны плот, бела насенне, жоўты сход.* Пшанічныя каласы» [4, № 547]; «*У сярэдзіне белае, а на версе краснае.* Цыбуля» [4, № 799].

У некаторых выпадках апісанне знешняга выгляду загаданага прадмета дапаўняецца ўказаннем на яго дзеянне або прызначэнне: «*Круглае, краснае, з хвосцікам, хто забача, той заплача. Цыбуля*» [4, № 603]; «*Шараваты, кудраваты, а навярху плеш, на здароўе з'еш.* Качан капусты» [4, № 651]; «*Круцестая, вярцестая, хто яе дбае, будзе сто год жыць.* Капуста» [4, № 652].

Як паказвае фактычны матэрыял, іншасказальная вербалізацыя зместу загадак пра флору часта мае комплексны характар: рэчыўны код у загадках спалучаецца з антрапаморфным: «*Ні вакон, ні дзвярэй – поўна горніца дзяцей.* Агурок» [4, № 703]; «*Кожна панна стаіць і кожна сваю пасцель дзяржыць.* Дрэва» [4, № 400]; «*Між гор ляжыць Рыгор плашчом накрыты, кійком падпёрты.* Гарбуз» [4, № 729] або зааморфным: «*Круглы хлявец повен белых авец.* Гарбуз» [4, № 713]; арнітаморфным: «*Стаіць певень на таку ў чырвоным каўпаку.* Мак у час квіцення» [4, № 778] ці фітаморфным: «*Пад зялёным дубком сядзіць клубком.* Рэпа» [4, № 752]; антрапаморфны код можа спалучацца з фітаморфным: «*Стаіць дуб, пад дубам дзеці.* Бульба» [4, № 600]. Такая структура загадкі садзейнічае рознабаковай абмалёўцы загаданага прадмета паводле яго знешняга выгляду, утвараемага дзеяння, стану, функцыі, прызначэння і выкарыстання, што ўзбагачае алгарытм яе разгадкі.

У некаторых загадках, прысвечаных рэаліям флоры, адзначаюцца сезонныя змены ў жыцці раслін: «*Вясна прыгрэе, шубу надзене; зіма наступае, шубу скідае.* Лісцёвае дрэва» [4, № 402]; «*Вісіць – зялёны, ляціць – жоўты, ляжыць – чорны.* Ліст» [4, № 421]; «*Было жоўтым, вырасла зялёным, сонца пацалавала, зноў жоўтым стала.* Пшаніца» [4, № 546]; «*Летам зялёны, а восенню чырвоны.* Яблык» [4, № 799]; «*На градцы – доўгі і зялёны, а ў бочцы – жоўты і салёны.* Агурок» [4, № 699] або змены стану загаданай рэаліі: «*Ляцеў пан, на ваду паў, паплыў, не патануў.* Ліст» [4, № 427]; «*Расла, павырасла, з куста вылезла, па руках пакацілася, на губах ачуцілася.* Гарох» [4, № 591].

Паводле формы выкладу зместу загадкі, як вядома, бываюць станоўчымі і адмоўнымі. У станоўчых загадках зашыфраваныя дэнататы і іх іншасказальныя субстытуты збліжаюцца па пэўных адзнаках, прыкметах або дзеянні. У адмоўных загадках загаданыя прадметы і іх метафарычныя эквіваленты, хаця і маюць падобныя прыкметы, супрацьпастаўляюцца [5].

Выключная большасць беларускіх народных загадак пра раслінны свет з'яўляюцца станоўчымі. У параўнальна нешматлікіх адмоўных загадках пра флору праводзіцца аналогія з прадметамі і з'явамі, якія не маюць ніякага дачынення да загаданага прадмета, але валодаюць падобнымі з зашыфраваным дэнататам адзнакамі. Супрацьпастаўленне дэнатата і яго субстытута вербалі-

зуецца праз уключэнне ў структуру загадкі адмоўных часціц *не*: «*Не прут, не дзерава, усю зіму зелена.* Хвошч» [4, № 522]; *ні*: «*Ні вакон, ні дзвярэй – поўна горніца дзяцей.* Агурок» [4, № 703]; супраціўных злучнікаў *а*, *ды* (*да*), *але* і адмоўнай часціцы *не*: «*Зялёная, а не луг, белая, а не снег, кучаравая, а без валасоў.* Бяроза» [4, № 411]; «*Не мора, а хвалюецца.* Ніва» [4, № 1524]; «*Не агонь, а пячэцца.* Крапіва» [4, № 525]; «*Не сучок, не лісток, не краска, а на дрэве расце.* Кара» [4, № 433]; «*Круглы, ды не гарбуз, з хвастом, ды не мыш.* Яблык» [4, № 801]; «*Зелена – не елка, красна – да не дзеўка. З хвастом – ды не мыш.* Бурак» [4, № 688]; «*Не цяпло, але паліцца.* Крапіва» [4, № 524]. Такая форма загадкі прымушае адрасата лагічна разважаць, стымулюе яго мысленчую дзейнасць і дае дадатковую падказку для разгадкі. Акрамя таго, яна стварае кантрастны характар выкладу зместу, што павышае выразнасць дыскурсу загадак.

Адметнымі паводле сваёй формы з’яўляюцца загадкі-пытанні, якія прапануюць адрасату разгадаць на аснове названых прыкмет або дзеяння зашыфраваны прадмет і актывізуюць яго ўвагу і ментальную дзейнасць. Размоўная інтанацыя такіх загадак, іх рыфмаваная форма ажыўляюць аповед, ствараюць займальнасць і экспрэсіўнасць выкладу: «*Вось вам новая задача: не арэх я і не куля, а як крышаць, кожны плача. Хто ж, рабяты, я*? Цыбуля» [4, № 639]; «*Стаіць у бары, маршчынкі на кары, галінкі пустыя, лісты разразныя. Хто ён*? Клён» [4, № 415]; «*У лазе – на адной назе, жыве ў лета, што гэта*? Грыб» [4, № 495]; «*Што гэта за дзерава зіму і лета зелена*? Хвоя» [4, № 409].

Размоўную інтанацыю маюць таксама загадкі-дыялогі, у якіх у жартаўлівай форме перадаецца дыялог персанажаў, што ўвасабляюць загаданы прадмет: «*Рыжа ў краснае спрасіла*: «*Чым ты бараду красіла*?» – «*Ані краскай, ані змазкай: перад солнышкам стаяла, угору бараду дзяржала*». Рабіна» [4, № 417].

У асобную групу можна выдзеліць загадкі пра расліны, складзеныя ў выглядзе невялікай мініяцюры, у якой, найчасцей ад імя першай асобы, іншасказальна распавядаецца пра асаблівасці загаданай рэаліі – форму, стан, а таксама выконваемае ў дачыненні да яе дзеянне: «*Прыйдзе восень – заб’ю лося, галаву з’ем, шкуру аблуплю, а мяса за плот выкіну.* Лён» [4, № 565]; «*Кроў маю п'юць, косці мае паляць, маімі рукамі адзін другога б'юць.* Бяроза» [4, № 413]; «*Ішоў я лесам і пад лесам найшоў я дзераўца, з таго дзераўца – два ствалы і два чаўны, а пятая шапка.* Жолуд» [4, № 438]; «*У траве, як аганькі, ружавеюць вугалькі, іх вадою не зальеш, рук і ног не апячэш. Дзень і ноч гараць, палаюць, смак яны мядовы маюць.* Суніцы» [4, № 473].

Такім чынам, у беларускіх народных загадках, прысвечаных раслiннаму свету, актыўна выкарыстоўваюцца разнастайныя спосабы іншасказальнай вербалізацыі зместу. Іншасказальныя вобразы загадак пра флору ўзяты з паўсядзённага народнага жыцця, даволі разнастайныя, канкрэтныя і рэалістычныя, заснаваныя часцей за ўсё на метафарычным мадэляванні іх семантыкі. Загадкі пра расліны садзейнічаюць развіццю мысленчай здольнасці, назіральнасці, кемлівасці і дасціпнасці адрасата, з’яўляюцца своеасаблівым сродкам пазнання і развіваюць наглядна-вобразнае ўспрыманне прадметаў і з’яў аб’ектыўнай рэчаіснасці. Слоўна-вобразная форма адлюстравання рэалій флоры ў беларускіх народных загадках спрыяе выяўленчай выразнасці, арыгінальнасці і непаўторнасці іх дыскурсу.

## Літаратура

1. Гурскі, А. І. Беларускія народныя загадкі / А. І. Гурскі // Загадкі / А. С. Фядосік (рэд.). – Мінск : «Навука і тэхніка», 1972. – С. 5–20.

2. Восточнославянский фольклор : Словарь научной и народной терминологии / Редкол.: К. П. Кабашников (отв. ред.) [и др.]. – Минск : «Навука і тэхніка», 1993. – 478 с.

3. Митрофанова, В. В. Русские народные загадки / В. В. Митрофанова. – Ленинград : «Наука», 1978. – 180 с.

4. Загадкі / А. С. Фядосік (рэд.) ; АН БССР. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Беларус. нар. творчасць. – Мінск : «Навука і тэхніка», 1972. – 448 с.

5. Лазутин, С. Г. Поэтика русского фольклора : учеб. пособие для филол. фак. ун-тов / С. Г. Лазутин – М. : «Высшая школа», 1981. – 221 с.

Гомельский государственный
университет имени Франциска Скорины

Поступила в редакцию 27.03.2023